*С.А.Пацыенка, аспірант БДУ культуры (г.Мінск)*

# ГІСТОРЫЯ ЗАМКАВАГА БУДАЎНІЦТВА НА ЗАХОДНІХ ЗЕМЛЯХ БЕЛАРУСІ ЯК АДЛЮСТРАВАННЕ МІЖКУЛЬТУРНАГА ЎЗАЕМАДЗЕЯННЯ НАРОДАЎ

За ўвесь час існавання Вялікага княства Літоўскага замкавае будаўніцтва зведала значныя змены. На працягу многіх стагоддзяў адбываліся перабудовы і ўдасканаленні замкавых пабудоў. Умовы і патрабаванні новых эпох паступова ператварылі магутныя раманскія цытадэлі ў шыкоўныя палацава-паркавыя ансамблі. Чым жа кіраваліся ў сваёй працы беларускія дойліды пры будаўніцтве замкаў, якія ўплывы адлюстраваліся ў замкавай архітэктуры Беларусі?

Заходнія землі Вялікага княства Літоўскага знаходзіліся ў зоне ўплыву еўрапейскіх краін, што не магло не адбіцца на развіцці мясцовага абарончага дойлідства. Гэта праявілася ў з'яўленні пабудоў у раманскім і гатычным стылях, выкарыстанні заходнееўрапейскай будаўнічай тэхнікі, а таксама ўжыванні новых катэгорыяў матэрыяльнай культуры: вялікапамернай цэглы (з XIII ст.), кафлі (з першай паловы XIV ст.), дахоўкі (з канца XIV – пачатку XV ст.).

Актыўнае развіццё абарончага дойлідства на заходніх землях Вялікага княства Літоўскага было выклікана барацьбой з крыжакамі. Пагроза з боку рыцараў павышала інтэнсіўнасць жыцця ў замках, патрабавала падтрымання старых цытадэляў у добрым стане, а таксама будаўніцтва новых. Акрамя таго, блізкае суседства з ордэнам давала беларускім майстрам магчымасць запазычваць асноўныя прынцыпы будаўніцтва ў ордэнскіх дойлідаў. Напрыклад, у першай палове XIV ст. на тэрыторыі Вялікага княства Літоўскага з'явіліся Лідскі, Крэўскі і Медніцкі замкі. Яны належалі да групы замкаў тыпу «кастэль», якія былі вядомы ў Германіі, Даніі, на поўдні Скандынавіі з XII ст.

Верагодна, што пры пераймані беларускімі будаўнікамі архітэктуры крыжацкіх замкаў нашымі продкамі былі запазычаны не толькі будаўнічыя прыёмы, але часткова падзел і прызначэнне ўнутранай прасторы гэтых пабудоў. Пацвярджэннем таму можа быць наяўнасць у рыцарскіх і беларускіх замках аднолькавых па прызначэнні будынкаў. Гэта датычыцца, напрыклад, замкавай капліцы, вязніцы, асобнага жылля начальніка замка.

Пэўнае падабенства сярэдневяковых беларускіх замкаў з іх ордэнскімі прататыпамі дае магчымасць атрымаць дадатковыя звесткі аб планіроўцы і прызначэнні тых ці іншых замкавых памяшканняў, тым больш, што падзел прасторы ордэнскіх замкаў быў абумоўлены спецыяльнымі прадпісаннямі ордэнскага статута. Так, для кожнага замка была характэрна абавязковая наяўнасць капітульнай залы, трапезнай

РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКІ

(refectorium), спальні братоў і ўзгаданых вышэй пакояў начальніка замка і капліцы. Акрамя таго, у галоўных замках меліся таксама інфірмарыі, ці фірмарыі – шпіталі.

У капліцы браты ордэна спраўлялі набажэнствы. Капітульная зала служыла галоўным прадстаўнічым памяшканнем замка. У ёй адбываліся сходы братоў, на якіх абмяркоўваліся планы дзеянняў ордэна, а таксама прымаліся справаздачы ад іншых кіраўнікоў ордэна. Трапезная выступала месцам правядзення агульнага прыёму ежы, які суправаджаўся чытаннем Свяшчэннага Пісання. Пад трапезнай звычайна знаходзілася кухня. Спальня была агульнай для ўсіх братоў. Згодна з патрабаваннямі статута, святло ў спальні нельга было гасіць, дзверы не павінны былі замыкацца, больш таго, яны павінны былі быць зарашочанымі, што давала магчымасць назіраць за спячымі. Жыллё начальніка замка размяшчалася асобна ад іншых памяшканняў і часам складалася з некалькіх пакояў. У некаторых замках існавалі памяшканні для прыезжых гасцей.

На наш погляд, у беларускіх замках існавалі памяшканні, якія выконвалі функцыю капітульных залаў. Так, у Княжацкай вежы Крэўскага замка праёмы вакон другога і трэцяга ярусаў адрозніваліся параўнальна вялікімі памерамі. Вядомы даследчык М.Шчакаціхін лічыў, што там размяшчаліся жылыя пакоі князя. Ю.А.Заяц дадае, што « гэта пацвердзілася пазнейшымі раскопкамі, пры якіх было сабрана больш за дзве тысячы фрагментаў тынкоўкі з фрэскавым роспісам». М.А.Ткачоў сцвярджаў, што княжацкія пакоі знаходзіліся на другім паверсе вежы, а трэці паверх быў абарончым. На нашу думку, на адным з гэтых паверхаў Княжацкай вежы магла размяшчацца капітульная зала. Менавіта вялікія праёмы акон, а таксама фрэскавы роспіс адрознівалі прадстаўнічае памяшканне замка. На карысць гэтай думкі і той факт, што ў дзяржаўным замку, які меў важнае стратэгічнае значэнне, павінна было быць памяшканне для правядзення сходаў і нарад вайсковага кіраўніцтва, а таксама сустрэчы замежных паслоў. Акрамя таго, калі ў 1345 г. Крэўскі замак на некаторы час ператварыўся ў паляўнічую рэзідэнцыю літоўскіх князёў, у ім сталі праводзіцца шматдзённыя баляванні. Для іх правядзення патрэбна было досыць вялікае замкавае памяшканне, якое б умяшчала ўсіх удзельнікаў банкетаў.

Мы лічым, што ў некаторых беларускіх замках па прыкладзе ордэнскіх існавалі шпіталі. Наяўнасць медыцынскага пункта ў месцах, дзе праходзілі вайсковыя дзеянні, відавочна. Аб гэтым сведчаць і некаторыя рэчы, знойдзеныя на замкавых дварах. Напрыклад, на тэрыторыі Лідскага замка была знойдзена медыцынская прылада для пускання крыві, якая ўяўляе сабой прамавугольны ў сячэнні стрыжань даўжынёй 11—15 см з адточанай дзюбкай. Нягледзячы на тое, што знаходка гэтая даволі рэдкая, яе наяўнасць дае падставу меркаваць, што ў Лідскай фартэцыі, як у некаторых ордэнскіх замках, існаваў шпіталь.

З надыходам эпохі Адраджэння мясцовы ўклад яшчэ больш узбагаціўся здабыткамі заходнееўрапейскай цывілізацыі і культуры. У

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

XVI–XVII ст. актыўна пашырылася практыка паездак за мяжу, дзе беларускія вандроўнікі знаёміліся з лепшымі дасягненнямі ва ўсіх галінах чалавечай дзейнасці. Магнаты Вялікага княства Літоўскага мелі дынастычныя, палітычныя, культурныя зносіны з вышэйшымі коламі еўрапейскай арыстакратыі. Яны не толькі наведвалі буйныя еўрапейскія двары, але нярэдка прымалі высокіх замежных гасцей у сябе. У 1518 г. адбыўся шлюб караля і вялікага князя Жыгімонта I з італьянкай Бонай Сфорцай. Нельга не адзначыць значнасці гэтай падзеі, вынікам якой стала непасрэднае пранікненне ў Вялікае княства Літоўскае ўплываў еўрапейскай культуры, а таксама знаёмства літоўскай знаці з умовамі свецкага жыцця Еўропы.

Пачынаючы з XVI ст., на змену агульнадзяржаўнаму замкаваму будаўніцтву ў Вялікім княстве Літоўскім прыйшло прыватнаўласніцкае. Прататыпы для сваіх рэзідэнцый магнаты знаходзілі падчас вандровак па Італіі (Нясвіжскі замак), Галандыі (Гальшанскі замак) і іншых еўрапейскіх краінах. Адтуль жа запрашалі да сябе архітэктараў, мастакоў, садоўнікаў і г.д. Напрыклад, Мікалай Радзівіл Сіротка стаў ініцыятарам прыезда ў Нясвіж італьянскага архітэктара Яна Марыі Бернардоні, па праекце якога быў узведзены цудоўны замак.

Але не толькі архітэктура сведчыла аб міжкультурных сувязях Вялікага княства Літоўскага з краінамі Еўропы. Археалагічныя знаходкі на замкавых тэрыторыях таксама пацвярджаюць актыўныя міжнародныя кантакты. Больш таго, канцэнтрацыя замежных тавараў у замках значна перавышала іх колькасць у гарадах. Асабліва гэта тычыцца прыватнаўласніцкіх рэзідэнцый, вялікая матэрыяльная забяспечанасць жыхароў якіх праявілася ў багацці і разнастайнасці начыння, твораў мастацтва, калекцый кніг, зброі, прывезеных з краін Еўропы, Скандынавіі, Прыбалтыкі і інш.

Такім чынам, на працягу ўсёй сваёй гісторыі Вялікае княства Літоўскае знаходзілася ў цесным узаемадзеянні з краінамі Еўропы і Балтыйскага басейна. Вынікам гэтага сталі добра наладжаныя палітычныя, эканамічныя, культурныя сувязі народаў гэтых дзяржаў. І адным з яскравых праяўленняў такога міжкультурнага ўзаемадзеяння з'явілася замкавае будаўніцтва на заходніх землях, зведаўшае непасрэдны ўплыў тэндэнцый еўрапейскай і скандынаўскай абарончай архітэктуры. Аднак працэс пераймання дасягненняў фартыфікацыйнага майстэрства беларускімі дойлідамі адбываўся не механічна, а шляхам іх творчага пераасэнсавання і падпарадкавання мясцовым традыцыям. У выніку гэтага на тэрыторыі Беларусі ўзніклі непаўторныя помнікі абарончага дойлідства са сваімі спецыфічнымі рысамі і стылёвымі асаблівасцямі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ